# «МЫ ПРОСТА АБАВЯЗАНЫ ЗГУРТАВАЦЦА І ДЗЕЙНІЧАЦЬ АДЗІНЫМ ФРОНТАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Цяпер неабходна засяродзіцца на рабоце па больш хуткай рэалізацыі ўжо сёлета дарожнай карты з кітайскім бокам. Таксама асабліває значэнне набывае партнёрства з КНР у сферы лічбавых транспартных калідораў. Рэалізацыя гэтага напрамку дапаможа перайсці на комплексную электронную тэхналогію перавозкі грузаў чыгуначным транспартам паміж дзяржавамі нашага саюза і Кітаем», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Адмысловае значэнне, працягвае Прэзідэнт, мае абмеркаванне цэлага шэрагу праектаў па ўдзеле Узбекістана ў ініцыятывах Саюза. У гэтым кантэксце ён адзначыў высокі ўзровень узаемадзеяння паміж ЕАЭС і Кубай, а таксама цікавасць Венесуэлы, што сведчыць аб значным патэнцыяле для ўмацавання нашага эканамічнага супрацоўніцтва.

«Пытанні не новыя. У большасці гэтыя мерапрыемствы праходзілі ўжо ў нашых дакументах і планах. Цяпер проста трэба надаць ім больш часу і ўвагі з тым, каб дабіцца патрэбнага выніку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

І ў завяршэнне ён паведаміў, што ў Беларусі распачата актыўная падрыхтоўка да арганізацыі ў жніўні 2023 года Другіх Гульняў краін СНД. Папярэднія Гульні адбыліся ў 2021 годзе ў Казані.

«Калі мы хочам працягваць гэтую добрую традыцыю, прашу ўсіх калег актыўна далучыцца да работы, даць неабходныя даручэнні зацікаўленым у вашых краінах. Свята спорту павінна стаць для нашых народаў яшчэ адным сімвалам сяброўства і згуртаванасці», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Ён рэзюмаваў, што перад краінамі стаяць няпростыя задачы, вырашаць якія неабходна ў паскораным рэжыме.

«І ўсё гэта адбываецца на фоне глабальнай нявызначанасці, яшчэ больш сур'ёзнай, чым у перыяд распаўсюджвання ковіду. Аднак я перакананы, што сумеснымі намаганнямі, рэалізаваўшы ў поўнай меры магчымасці Еўразійскага эканамічнага саюза, пераадолеўшы свой нацыянальны эгаізм, мы паспяхова пройдзем усе выпрабаванні», — адзначыў кіраўнік краіны.

Сваё меркаванне наконт вынікаў зробленага ў саюзе, яго будучыні ва ўмовах санкцыйнага ціску на асноўных гульцоў выказалі лідары іншых краін — членаў саюза і дзяржаў, што маюць статус назіральніка ў ЕАЭС (Узбекістан, Куба).

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:** «У вузкім фармаце разгледжана важнае пытанне развіцця еўразійскай інтэграцыі — ход выканання стратэгіі да 2025 года. Старшыня калегіі далажыў пра балючыя моманты, зыходзячы з якіх неабходна паскорыцца. Асноўны акцэнт зроблены на неабходнасці паскарэння ўнутрыдзяржаўных працэдур па падпісаных рашэннях. Кіраўнікі краін выслухалі адпаведную інфармацыю, дадзены даручэнні ўрадам сумесна выпрацаваць кансалідаванае рашэнне, што дазволіць гэтыя пытанні вырашыць хутчэй. Абмяркоўвалі пытанні пералічэння пошлін з улікам санкцыйнага ціску калектыўнага Захаду на Расію і нашу краіну. Прынята і падпісана рашэнне, што пералічэнні пошлін у Беларусь і Расію будуць у расійскіх рублях. Усе астатнія нашы партнёры пакуль пакідаюць за сабой права іх ажыццяўляць у доларах. Даручылі калегіі разам з урадамі дадаткова вярнуцца да гэтага пытання і пралічыць, каб не было страт для бюджэтаў краін».

* * *

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пасля заканчэння пасяджэння правёў аператыўную нараду па актуальных пытаннях з прадстаўнікамі ўрада і Адміністрацыі Прэзідэнта. Галоўнай тэмай стала сітуацыя ў эканоміцы, перадае карэспандэнт БелТА.**

Адзін з асноўных акцэнтаў у абмеркаванні быў зроблены на работу па працідзеянні санкцыям. Таксама размова ішла аб функцыянаванні фінансавага сектара, стане спраў на вялікіх прамысловых прадпрыемствах.

Асобнай тэмай сталі дамоўленасці па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у пачатку тыдня. Гэта, у прыватнасці, работа над сумеснымі праектамі ў сферы імпартазамяшчэння, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Уздымалася і пытанне будаўніцтва беларускага порта на расійскай Балтыцы.

Улічваючы, што акрамя прадстаўнікоў эканамічнага блока сярод удзельнікаў нарады быў міністр замежных спраў, Аляксандр Лукашэнка актуалізаваў задачы для знешнепалітычнага ведамства. У першую чаргу ў кантэксце давядзення да партнёраў беларускай пазіцыі па актуальных пытаннях.

Што датычыцца ўзаемадзеяння з суседнімі краінамі, абмяркоўвалася работа ў рамках падоўжанага да канца года права бязвізавага ўезду і знаходжання ў Беларусі для грамадзян Літвы і Латвіі. Аляксандр Лукашэнка даручыў зняць бар'еры і блакіроўкі для жыхароў гэтых суседніх краін. У тым ліку кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб адмене ПЛР-тэстаў для ўезду ў Беларусь.

# «Усе спробы сагнуць, задушыць нас спараджаюць меры ў адказ і робяць нас толькі мацнейшымі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Уладзімір Паўлавіч, вы адзін з самых паважаных і вопытных палітыкаў Беларусі. Вы бачылі на ўласныя вочы падзеі станаўлення суверэнітэту нашай краіны. Ці згодны з тым, што апошнім часам Беларусь перажывае самыя няпростыя часы ў сваёй найноўшай гісторыі?***



— У найноўшай гісторыі краіны былі не менш складаныя перыяды. У 90-я гады XX стагоддзя гаворка ішла аб самім існаванні Беларусі як самастойнай дзяржавы. Неабходна было накарміць людзей і задаволіць іх базавыя патрэбнасці, захаваць вытворчасці і калектывы, выбраць шлях развіцця і рэалізаваць яго на практыцы, гарантаваць нацыянальную бяспеку. Дзесяцігоддзі мы жылі ва ўмовах разнастайных абмежаванняў і санкцый, але паслядоўна будавалі краіну.

Сёння няпросты перыяд для ўсяго свету ў цэлым і Беларусі як яго часткі. Адбываецца перафарматаванне сусветнай палітыкі, трансфармацыя фінансавых і эканамічных інстытутаў, рэвізія культурных і грамадскіх каштоўнасцяў. Аднак і мы іншыя. Наша краіна адбылася як незалежная дзяржава, дынамічна функцыянуюць усе інстытуты кіравання, эканоміка і сельская гаспадарка. Актыўна фарміруецца грамадзянская супольнасць і ўдасканальваецца палітычная сфера. Беларускі народ падтрымаў Прэзідэнта і прыняў абноўленую Канстытуцыю краіны. Дзяржава адстойвае ўласныя інтарэсы ва ўмовах глабальных змяненняў, дастаткова паспяхова процідзейнічае санкцыйнаму ціску і прадаўжае развівацца, адаптуючыся да сучасных умоў.

***— Вы адзначалі, што Канстытуцыя была напісана разам з народам, таму простыя беларусы павінны далучыцца і да напісання законаў, што яе развіваюць. Якім чынам плануецца прыцягваць насельніцтва да гэтай працы?***

— Гэты механізм адпрацаваны дзесяцігоддзямі парламенцкай практыкі. Круглыя сталы, семінары, выязныя і сумесныя пасяджэнні пастаянных камісій з запрашэннем вучоных, практыкаў, прадстаўнікоў працоўных калектываў, непасрэдныя сустрэчы з выбаршчыкамі і грамадскае абмеркаванне найбольш значных законапраектаў — гэта элементы заканатворчага працэсу. Яго мэта — выпрацаваць правілы паводзін фізічных і юрыдычных асоб, грамадства і дзяржавы ў канкрэтнай сферы, максімальна ўлічыць інтарэсы ўсіх бакоў і замацаваць іх заканадаўча. Гэта магчыма толькі падчас сумеснай працы парламентарыяў і грамадзян, якім жыць паводле гэтых законаў. Справядлівасць, адказнасць, клопат — прынцыпы беларускай дзяржаўнай палітыкі, якія практычна рэалізоўваюцца Палатай прадстаўнікоў.

***— Складаная знешнепалітычная сітуацыя вакол Беларусі, безумоўна, адлюстравалася і на парламенцкай супольнасці. Голас беларускіх дэпутатаў застаўся не пачуты на некаторых міждзяржаўных парламенцкіх пляцоўках. Як, улічваючы гэта, парламентарыі мусяць далей працягваць сваю міжпарламенцкую дзейнасць?***

— Супраць нашай краіны вядзецца гібрыдная вайна, элементамі якой з'яўляюцца інфармацыйны і палітычны ціск. Аб'яднаны Захад пад кіраўніцтвам ЗША адзіным фронтам спрабуе задушыць іншадумства і захаваць уласнае дамінаванне, заснаванае на рабаванні і эксплуатацыі. Аднак сітуацыя істотна змянілася. Сфарміраваліся новыя цэнтры сілы, сотні дзяржаў свету не жадаюць быць чужымі калоніямі. Сутыкнуўшыся з агрэсіўнымі паводзінамі Еўрапейскага саюза, мы пашыраем узаемадзеянне з нашымі стратэгічнымі партнёрамі: Расійскай Федэрацыяй і Кітайскай Народнай Рэспублікай, з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Блізкага Усходу, выкарыстоўваем пляцоўкі БРІКС, АДКБ, іншых арганізацый.

Еўропа — гэта не больш чым адзін з рэгіёнаў свету, не самы вялікі, не самы багаты і не самы перспектыўны, улічваючы палітычныя працэсы, якія ў ім адбываюцца. Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне паспяхова прадаўжаецца з тымі, хто настроены на канструктыўны і раўнапраўны дыялог, а гэта дзясяткі дзяржаў свету. Мы паслядоўна адстойваем свае інтарэсы на міжнародных пляцоўках, улічваючы рэальныя ўмовы абстаноўкі.

***— Палітычны ціск на Беларусі ўзмацніўся і санкцыйнай палітыкай. Каб падтрымаць эканоміку, дэпутаты прымаюць законапраекты для дапамогі пераадольвання гэтай сітуацыі. Якая сутнасць закладзена ў гэтых законапраектах?***

— Сутнасць законапраектаў вельмі простая — стварыць максімальна камфортныя ўмовы для работы нацыянальнай эканомікі, пераадолення наступстваў санкцыйнага ціску на дзяржаву і захавання дастойнага ўзроўню жыцця беларускіх грамадзян. Наша краіна не адмаўляецца ад рэалізацыі сацыяльна арыентаванай палітыкі, робіць усё магчымае, каб захаваць стабільнасць у грамадстве і забяспечыць патрэбы людзей. Дэпутацкі корпус, як галіна дзяржаўнай улады, аператыўна рэагуе на запыты эканомікі, бізнесу, фінансавага і сельскагаспадарчага сектараў.

Аб устойлівасці і эфектыўнасці створанай у краіне сістэмы кіравання сведчыць тое, што паліцы ў магазінах не апусцелі, прадпрыемствы працуюць, сацыяльныя аб'екты і медустановы функцыянуюць у звычайным рэжыме, паспяхова завершана пасяўная кампанія. Для грамадзян нашай краіны створаны ўсе ўмовы для дастойнага жыцця.

***— Санкцыйны ціск, палітычнае ігнараванне пазіцыі Беларусі, узмацненне ваеннай пагрозы. У такіх рэаліях сёння жыве наша краіна. Як вы думаеце, беларусы здолеюць годна вытрымаць выклікі?***

— На долю беларускага народа за стагоддзі нашай гісторыі выпала мноства выпрабаванняў. Адно з самых страшных — Вялікая Айчынная вайна. Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара. Нашы дзяды і прадзеды выстаялі і абаранілі сваю зямлю, аднавілі краіну і перадалі яе нам.

Сёння супраць Беларусі і Расіі вядзецца глабальная вайна, накіраваная на знішчэнне славянскага міру. Наша самастойнасць, імкненне жыць уласным розумам, адстойваць традыцыйныя каштоўнасці выклікаюць непахісную агрэсію Заходняга свету. Асноўны ўдар наносіцца па свядомасці людзей, а экспансія вядзецца праз сферы эканомікі і фінансаў, інфармацыі і псіхалогіі. Для гэтага ўводзяцца санкцыі, аб'яўляюцца эмбарга, блакіруюцца фінансавыя актывы, вядзецца вайна з помнікамі, прымяняецца рэальная ваенная сіла.

Мы, беларусы, — мірныя людзі, але ў нас жыве дух пераможцаў. Усе спробы сагнуць, задушыць нас спараджаюць меры ў адказ і робяць нас толькі мацнейшымі. Мы ні ў кога нічога не просім, умеем сябраваць і працаваць, жывём на ўласнай зямлі і гатовы яе абараняць. А сённяшнія выклікі — гэта шанц аб'ектыўна ацаніць абстаноўку, правесці глабальную рэвізію сіл і сродкаў, удакладніць прыярытэты і выпрацаваць напрамкі далейшага развіцця.

Не выклікае сумневу, што народ, які выдужаў у гады ліхалеццяў, які захаваў уласную самабытнасць і культурны код, які падняў з попелу краіну і стварыў нацыянальную дзяржаву, здольны пераадолець любыя цяжкасці. Нам ёсць чым ганарыцца, што берагчы і што перадаць дзецям і ўнукам.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота БелТА.**

# ПАД АХОВАЙ КВЕТКІ-СЯМІКОЛЕРНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Знакавым мерапрыемствам стане гашэнне фестывальнага канверта з арыгінальнай маркай, эскіз якога распрацаваны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі.

Упершыню ў рамках фестывалю будзе арганізаваны круглы стол «Беларусь — наш агульны дом: адзінства нацый і пакаленняў». У старажытным будынку, які адрамантаваны ў каралеўскім стылі, збяруцца кіраўнікі 21 нацыянальнага аб'яднання, каб абмяняцца думкамі і ўражаннямі.



## Запросяць на падворкі

Самым насычаным на падзеі абяцае быць другі дзень. Госці наведаюць нацыянальныя падворкі. І гэта, бадай, самы прывабны і любімы шпацыр. Тут брамкі адкрыюцца ўжо апоўдні. Будзе арганізавана 17 падворкаў, якія зоймуць увесь гістарычны цэнтр горада і створаць адпаведную атмасферу. Беларускі падворак прадставіць шырокі спектр народнай культуры.

— Станоўча зарэкамендаваў сябе вопыт мінулага фестывалю, калі на беларускім падвор'і былі прадстаўлены ўсе рэгіёны Беларусі, такое ж рашэнне прынята і сёлета, — зазначыла Алена Клімовіч. — Гэта вельмі добра, бо беларуская культура і традыцыі адрозніваюцца ў тэрытарыяльным плане. Такім чынам, госці змогуць пабачыць нашу самабытнасць.

Усе рэгіёны краіны прадставяць свой турыстычны патэнцыял на пляцоўцы «Беларусь вачыма турыста».

У Год гістарычнай памяці плануецца прэзентацыя тэматычных выставачных праектаў, а таксама кніг «Сёстры Хатыні. Гродзеншчына» і «Фестываль жыцця» аб гісторыі форуму.

Адбудуцца шматлікія канцэрты прафесійных і аматарскіх калектываў. Выступяць зоркі беларускай эстрады. У дворыку гарадскога кінатэатра будзе арганізаваны прагляд кінафільмаў пад адкрытым небам. Адбудуцца спартыўныя спаборніцтвы, колар-фэст, майстар-класы і творчыя праграмы.

Сваіх аматараў збярэ фестываль вулічнага экстрыму з удзелам прадстаўнікоў рэгіёнаў Беларусі.

## Трэці дзень — на канале

У трэці, заключны, дзень фестывалю арганізатары запросяць усіх на Аўгустоўскі канал, дзе адбудзецца ўрачыстае адкрыццё турыстычнага сезона. Такі фармат упершыню паспрабавалі ўвесці на мінулым фестывалі, і ён прыйшоўся многім па душы. Падлічана, што тады на канале пабывала да 10 тысяч чалавек. Сёлета праграма даволі насычаная. У першай палове дня адбудзецца канцэрт аматарскіх калектываў вобласці і рэгіянальны фестываль — конкурс харэаграфічнага мастацтва.

Усе прысутныя змогуць ацаніць смак беларускіх страў Гродзеншчыны падчас гастрафэсту. А яшчэ можна будзе паўдзельнічаць у спаборніцтве на тачках і па кіданні валёнак. Паспрабаваць сваю моц у шоу сілачоў. «Курыныя забегі», конкурсы на хуткае паяданне сасісак і дранікаў, фестываль рыбнай лоўлі акунуць гасцей у вясёлае загараднае жыццё.

Будуць працаваць кірмашы, выстаўкі, атракцыёны, інтэрактыўныя пляцоўкі. Для дзяцей арганізуюць «Казкі на траве», прапануюць пабываць у ролі будаўнікоў і канструктараў Аўгустоўскага канала ў міні-фармаце. Для тых, хто хоча агледзець маляўнічыя пейзажы з палубы, такую магчымасць дадуць два цеплаходы.

Усе тры дні фестываль будзе радаваць гасцей найлепшымі вакальнымі і танцавальнымі калектывамі. Песні і музыка не змоўкнуць ні на хвіліну. На галоўнай сцэне адбудзецца канцэрт ансамбля «Песняры» і Аляксандра Саладухі. Выступіць Руслан Аляхно.

Як расказала Алёна Клімовіч, арганізавана трансляцыя мерапрыемстваў фестывалю ў сродках масавай інфармацыі. Будуць прамыя ўключэнні тэлеканаламі краіны. Для работы журналістаў створаны прэс-цэнтр. «Арганізатары імкнуліся прадбачыць усё, каб аб фестывалі ведалі не толькі ў Гродне і вобласці, але і за яе межамі. Бо фестываль нацыянальных культур сёння — гэта не проста яркая культурная традыцыя гродзенскай зямлі, а пляцоўка для міжнацыянальнага дыялогу», — падкрэсліла Алёна Клімовіч.

## Скарбы фестываляў

Гісторыя фестывальнага руху пачалася ў 1996 годзе. Тады ж з'явілася і эмблема — кветка-сямікалернік. Лагатып крыху мяняўся, але аснова засталася той жа.

Кожны фестываль уносіў нешта новае ў гарадское асяроддзе. Так, у горадзе з'явіўся сквер Сяброўства. Дарэчы, ён папаўняецца новымі дрэўцамі з кожным святам. Незвычайнае пано з графіту з арнаментам суполак-удзельніц упрыгожыла сцяну будынка ў гістарычным цэнтры.

Да фестывалю былі ўстаноўлены скульптуры «Купідон» — каля гарадскога ЗАГСа і «Вернасць» — пара бронзавых лебедзяў на вадзе ў Швейцарскай даліне. А на беразе Нёмана ў гонар свята пачаў дзейнічаць «Фантан фестывальнага сяброўства».

Юбілейны — дзесяты — фестываль азнаменаваны адкрыццём памятнага знака на месцы легендарнай Фары Вітаўта ў цэнтры горада. А каля Старога замка з'явілася скульптура старадаўняй ладдзі — павялічанай копіі шахматнага артэфакта, які быў знойдзены падчас раскопак Замкавай гары.

Для захавання экспанатаў і папулярызацыі фестывалю ў цэнтры горада адкрыты культурны цэнтр «Фестывальны». У якасці экспанатаў — фотаздымкі, касцюмы, сувеніры нацыянальных суполак, падарункі замежных гасцей.

На мінулым свяце на вуліцы Замкавай адкрылі помнік Давыду Гарадзенскаму, а на беразе Нёмана — прыгожую аглядальную пляцоўку-ратонду. Дарэчы, сёлетні, чарговы фестываль папоўніць гарадское асяроддзе ажно цэлым комплексам узноўленых гістарычных пабудоў. З'явіцца і новая скульптура.

Менавіта падчас фестывалю ў горадзе прайшло першае феерычнае лазернае шоу на беразе Нёмана. Не абыдзецца без феерверку і фаер-шоу і гэтым разам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

# КАЛІ КРЭДЫТ ПАТРЭБЕН ЯК ПАВЕТРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Аптымальны варыянт крэдытнай праграмы

Мае сэнс звярнуць увагу на мэтавыя праграмы банкаў. Такія крэдыты, мяркуючы па назве, выдаюцца толькі на канкрэтныя мэты: будаўніцтва, развіццё бізнесу, навучанне і іншае. Мэтавыя крэдыты часцяком аказваюцца больш таннымі, чым нямэтавыя, бо банк мае магчымасць сачыць за расходаваннем сродкаў.

Калі ваша будучая купля не адпавядае ні адной з існуючых праграм, лагічна вывучыць рынак спажывецкага крэдытавання. Галоўны арыенцір — памер працэнтнай стаўкі. Пры гэтым не варта забываць аб умовах і парадку атрымання крэдыту.

Пасля таго як вызначыцеся з мэтай крэдыту, пачынайце шукаць банк. Звяртайце ўвагу на такія ўмовы крэдытавання, як памер працэнтных ставак, наяўнасць камісій, патрабаванні да закладаў або паручыцельства, водгукі кліентаў. Абавязкова пацікаўцеся, якая будзе эфектыўная працэнтная стаўка. Для кліента гэта важны паказчык, па якім можна даведацца пра поўны кошт крэдыту, уключаючы камісіі і аплату паслуг трэціх асоб (натарыуса, за дзяржаўную рэгістрацыю закладу).

## Купляць лепш (танней) не замежнае, а сваё

У найбуйнейшым банку краіны мы знайшлі спажывецкія крэдыты толькі на набыццё тавараў беларускіх вытворцаў. Ён так і называецца: крэдыт «Партнёр аптымальны». Гэтая праграма прадугледжвае крэдыт на тэрмін да 3 гадоў з адтэрміноўкай па выплаце асноўнага доўгу на працягу 12 месяцаў. Сёння эфектыўная стаўка па такім крэдыце складае 20,75 %, або стаўка рэфінансавання Нацбанка плюс 8,75 % гадавых.

Крэдыт даецца ў аддзяленнях банка і аддзяленнях Белпошты як дзеяздольным грамадзянам нашай краіны, так і замежным грамадзянам (асобам без грамадзянства), якія пастаянна пражываюць у Беларусі і атрымліваюць тут даходы, у тым ліку праз прадстаўніцтва замежнай юрыдычнай асобы на тэрыторыі нашай дзяржавы.

Сярод перавагі крэдыту асобна вылучаюць афармленне яго без паручыцеляў і страховак, адсутнасць дадатковых камісій і плацяжоў за карыстанне крэдытам і магчымасць афармлення крэдыту без прад'яўлення даведкі аб даходах у памеры, разлічаным зыходзячы з сярэднямесячнага чыстага даходу, які не перавышае 20 базавых велічынь. Пагашэнне крэдыту ажыццяўляецца раўнамернымі ўзносамі ў перыяд пагашэння. Таксама прадугледжаны зручныя спосабы пагашэння крэдыту (у інфакіёсках банка, праз сістэму «Інтэрнэт-банкінг», паслугу «М-банкінг», аўтааплата).

Сам крэдыт выдаецца шляхам безнаяўнага пералічэння на рахункі трэціх асоб на падставе рахунку-фактуры. Парадак выплаты працэнтаў вядзецца роўнымі сумамі ў адпаведнасці з графікам пагашэння. А забеспячэннем крэдыту з'яўляецца механізм няўстойкі. Банк нагадвае, што працэнтная стаўка за карыстанне крэдытам плавае і змяняецца з дня змянення стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка краіны.

Таксама ў сістэмных банках нашай краіны дзейнічае праграма льготных крэдытаў на мэтавыя патрэбы, або для пэўнай катэгорыі кліентаў. Так, напрыклад, ільготны крэдыт маладым спецыялістам прапануе пазыковыя грошы ў суме да 4,5 тысячы рублёў на тэрмін да 60 месяцаў пад 3 % гадавых. Ільготны крэдыт на газіфікацыю індывідуальнага жылля ў суме да 50 тысяч рублёў можна атрымаць на тэрмін да 24 месяцаў таксама пад 3 % гадавых. Існуе яшчэ льготны крэдыт на развіццё асабістых падсобных гаспадарак. Ён выдаецца на тэрмін да 84 месяцаў пад 5 % гадавых. Узрост такіх крэдытаатрымальнікаў можа вар'іравацца ад 18 да 63 гадоў. Гарантыяй атрымання крэдыту з'яўляюцца абавязковыя паручыцелі і даведкі аб даходах.

## Без паручыцеляў і даведак — дарагія крэдыты

Сёння ў нашай краіны няпросты час. Таму за магчымасць купіць у доўг дарагую, замежную «цацку» даводзіцца плаціць вялікія грошы. Практычна ўсе сярэднія камерцыйныя банкі цяпер прапануюць не вельмі вялікія крэдытныя грошы (ад 5 тысяч да 15 тысяч рублёў) без даведак аб даходах і без паручыцеляў. Такі крэдыт выдаюць тэрмінам да 12—15 месяцаў. Аднак працэнтная стаўка ў такіх крэдытаў адрозніваецца ад стандартных спажывецкіх праграм у разы — ад 30 % да 45 % гадавых.

Патрабаванні да кліента, які пагодзіцца на такі рабаўніцкі крэдыт, мінімальныя. Узрост пазычальніка павінен быць ад 21 года да 65 гадоў. Ён носіць з сабой дакумент, які сведчыць асобу заяўніка, а для мужчын ва ўзросце да 27 гадоў — наяўнасць ваеннага білета або дакументаў, якія пацвярджаюць права на адтэрміноўку ад прызыву на вайсковую службу.

## Не парушайце фінансавы баланс

Карыстацца пазыковымі грашыма, безумоўна, зручна і прыемна, а ў асобных выпадках і выгадна. Але нельга забываць аб тым, што доўг трэба вяртаць.

Таму падыходзіць да атрымання крэдыту трэба ўзважана. Штомесячны плацеж не павінен перавышаць 40—50 % сямейнага бюджэту. У адваротным выпадку абавязацельствы па крэдыце ператворацца ў непасільную ношу. Вызначыць штомесячную долю выплат па крэдыце ў агульным аб'ёме асабістых фінансаў можна, скарыстаўшыся інфармацыяй аб умовах крэдытавання (яе банк абавязаны даць кліенту да заключэння крэдытнага дагавора). Таксама спецыялісты раяць прыняць да ўвагі спадарожныя выдаткі, звязаныя з набыццём дарагой маёмасці: яркі прыклад — аўтакрэдыт. Не забудзьцеся, што статус аўтаўладальніка абавяжа вас раскашэліцца на тэхнічнае абслугоўванне машыны, аплату аўтастаянкі, абавязковае страхаванне. Таму перад прыняццем рашэння сумуйце ўсе плацяжы, спалучаныя з будучай купляй.

## Не бярыце доўгатэрміновыя крэдыты дзеля імгненных задавальненняў

Адпачынак на Гаваях, вядома, падорыць вам некалькі незабыўных тыдняў. Аднак ці варта гэтае задавальненне таго, каб на працягу двух гадоў выкройваць з сямейнага бюджэту круглենькую суму? Вучыцеся жыць па сродках і супастаўляць кошт задавальненняў са сваімі даходамі. Бо, калі падумаць, ад адпачынку на беларускіх азёрах можна атрымаць не менш яркія ўражанні і пазітыўныя эмоцыі, чым на акіянскім узбярэжжы. Галоўнае — пазітыўны настрой і добрая кампанія.

## Уважліва чытайце крэдытны дагавор

Асабліва пункты «правы банка» і «абавязкі пазычальніка». Увагу трэба звярнуць на суму крэдыту (ці не вырасла яна за кошт камісій і плат за паслугі, уключаныя ў дагавор?), на ўмовы датэрміновага пагашэння (ці ёсць абмежаванні?) і на тэрмін дзеяння пагаднення паміж пазычальнікам і банкам. Абавязкова азнаёмцеся з інфармацыяй аб умовах крэдытавання, дзе, акрамя працэнтнай стаўкі, магчымы і дадатковыя плацяжы па афармленні і абслугоўванні крэдыту. Напрыклад: камісія за зняцце грошай з рахунку ў розных банках можа складаць ад 1,5 да 5 працэнтаў. Калі крэдыт «кароткі», высокі працэнт за атрыманне наяўных істотна павысіць кошт пазычаных грошай. Будзьце пільнымі, бо пасля падпісання дагавора з банкам застаецца толькі адно — выконваць прынятыя на сябе фінансавыя абавязацельствы.

## Не спяшайцеся быць паручыцелем

Чалавек, які ручаецца за выкананне пазычальнікам абавязацельстваў перад банкам, павінен усведамляць усю меру адказнасці, якую ён будзе несці па дагаворы паручыцельства. Калі крэдытаатрымальнік па нейкіх прычынах не зможа пагашаць крэдыт, яго фінансавыя даўгі перад банкам аўтаматычна пераходзяць да паручыцеляў, нагадваюць спецыялісты. У гэтым выпадку такі паручыцель, магчыма, будзе мець пэўныя цяжкасці пры афармленні свайго асабістага крэдыту.

## Будзьце з банкам у партнёрскіх адносінах

І гэта вам акупіцца ў сто разоў. Улічвайце інтарэсы свайго дзелавога партнёра, і ён адкажа вам тым жа. Разгледзім канкрэтную сітуацыю. У пазычальніка ўзніклі часовыя фінансавыя цяжкасці. Ён можа: а) залегчы на дно, б) паведаміць банку пра свае праблемы. У першым выпадку залічэнне ў чорны спіс нядобрасумленных крэдытаатрымальнікаў гарантаванае. У другім банк можа прапанаваць кампрамісны варыянт (адтэрміноўку плацяжу). Не варта забываць: узаемапавага — ключ да вырашэння многіх складаных пытанняў.

## Што кажа банкаўская статыстыка

Як перадае партал selekt.by, крэдыты, якія дадзены банкамі насельніцтву, істотна падаражэлі. У прыватнасці, сярэдняя стаўка па новых крэдытах фізічным асобам на тэрмін да 1 года вырасла да 13,64 % з 12,58 % гадавых у сакавіку. А па крэдытах на тэрмін звыш года яна павялічылася да 13,11 % з 12,36 %. Заўважу, што юрыдычным асобам значна складаней, бо крэдыты ім абыходзяцца нашмат даражэй. Сярэдняя стаўка па новых кароткатэрміновых рублёвых крэдытах прадпрыемствам у красавіку павялічылася да 19,05 % з 18,38 % гадавых у сакавіку, а па доўгатэрміновых — да 20,27 % з 18,3 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Супрацоўнікі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказваюць шчырыя спачуванні стылістычнаму рэдактару Таццяне Мікалаеўне Мордас у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**